http://www.partal.by/publications/brending_strany_neobhodimost_18.html. – Дата доступа : 04.03.2016.

3. В Минске появилось гигантское граффити с девушкой в вышиванке / Белорусский интернет-портал Республики Беларусь [Электронный ресурс] – Минск, 2015. – Режим доступа : http://news.tut.by/culture/472808.html. – Дата доступа : 04.03.2016.

4. Скобелев, Э.М. Герб, сцяг і гімн Беларускай Дзяржавы / Э.М. Скобелев, М.Э. Скобелев. – Мн. : Мастацкая літаратура, 2004. – 23 с.

5. XXV Международный фестиваль искусств «Славянский базар в Витебске» [Электронный ресурс] – Минск, 2015. – Режим доступа : http://fest-sbv.by/. – Дата доступа : 04.03.2016.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Белы А.У.,** студ. 303 гр.
Навуковы кіраўнік – Калацэй В.В.

## АСАБЛІВАСЦІ НАВУЧАННЯ НАЙГРЫШАМ ДА ПЕСЕНЬ У БЕЛАРУСКАЙ ФАЛЬКЛОРНАЙ СУПОЛЦЫ

Традыцыйная беларуская музыка жыве і ў наш час, але яе ўспрамаюць не ў такім аспекте, ў якім яна ўспрымалася ў традыцыйным грамадстве, часах класічнай вясковай грамады. Сёння на тэрыторыі Беларусі існуе шмат інтсрументальных калектываў, якія выкарыстоўваюць народныя інструменты і іграюць традыцыйны рэпертуар. Зараз музычную традыцыю змяняюць не толькі ў рамках імправізацыі. Існуе вялікая колькасць напрамкаў, у якіх ёсць элементы беларускай народнай музычнай традыцыіі, але, гэта не гаворыць аб тым, што гэтыя напрамкі – традыцыйная музыка. Гэта – сучасная музыка з фальклорнымі элементамі.

Дзеля больш якаснага разгляду пытання сучаснага музіцыравання неабходна пэўная сістэматытызацыя. Мне падаецца лагічным падзел сучасных арыентаваных на беларускі рэпертуар ансамбляў на фальклорныя, постфальклорныя гурты, фальклорныя гурты змешаннага характару, гурты альтэрнатыўнай музыкі з фальклорнымі элементамі.

Фальклорныя гурты (першаснага характару – якія з’явіліся ў натуральных ўмовах). Зараз фальклорнымі гуртамі можна назваць толькі выключныя калектывы носьбітаў і іх не шмат. Інструментальных калектываў сярод іх і таго меней. Збольшага пра іх зараз бытуюць толькі ўспаміны і іхнія музычныя інструменты;

Постфальклорныя гурты (якія з’явіліся ва ўрбаністычных ўмовах, але прытрымліваюца традыцыйных канонаў): «Ветах», «Ліцьвіны», «Капэля На Таку», «Капэля Алеся Лася», «Жвавы Карчмар» і г.д.; Фальклорныя гурты змешаннага характару (іграюць сярэднявечную музыку, але часам можна ад іх пачуць і традыцыйныя фальклорныя матывы; яны не вельмі сур’ёзна адносяцца да фальклору, але ўсё роўна прэтэндуюць на традыцыйны рэпертуар): «Стары Ольса», «Тутэйшыя», «Тутэйшая шляхта», «Цяжкое дрэва», «PAWA» і г.д. Альтэрнатыўная музыка з фальклорнымі элементамі: «Зніч», «ЛітвінТроль», «Кашлаты Вох», «Рокаш» і інш.

Тэрмін «постфальклор» увёў прафесар Сяргей Юр'евіч Неклюдаў, прафесар. У яго інтэрпретацыі галоўная роля ўзнікненя тэрміну «постфальклор» – НТР (Навукова Тэхнічная Рэвалюцыя). Згодна з С.Ю. Неклюдавым, з’яўленне новага сацыяльна-камунікацыйнайга арэалу (тэлефон – радыё – телебачанне) можна лічыць нараджэннем з’явы «постфальклору». Прасцей сказаць, фальклор трапіў у новы арэал і пачаў там дзельнічаць. У гэтым працэссе функцыянальнасць фальклору змянілась, так і з’явіўся «постфальклор». Але, каб лепей зразумець, што

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сабой уяўляе «постфальклор», з'вернемся да Пракоф'ева В.Н. Ён піша, што есть адзін прызнак, па якому можна вылучыць «постфальклор». «Постфальклор» – вырабляюць прафесіяналы на збыт, а фальклор – просты люд дзеля сваіх патрэб і патрэб сваёй супоцьнасці. Кожны постфальклорны гурт выбірае музычныя інструменты згодна са сваім гукаідэалам. У час даследвання гісторыі кожнага з гэтых інструментаў у выніку можна вылучыць такія інструменты, якія можна назваць агульнаславянскімі: дуда, гуслі, варган, гармонік, скрыпка, колавая ліра і гэтак далей. Гэтыя інструменты маюць розныя назвы, маленькую розніцу ў канструкцыйных асаблівасцях і розныя кампазітныя матэрыялы, з якіх вырабляўся пэўны інструмент. акрамя гэтага яны маюць розныя асаблівасці выканання, але маюць так сама вялікую колькасць падабенстваў. Гэтыя сучасныя калектывы не адзіныя, якім бліжэй гук інструментаў свайго этнасу. На наш погляд гэта можна аднесці да генетычнай памяці.

Сэнс музіцыравання – навучыцца творчаму самаадлюстраванню, самарэалізацыіі, развіццю фантазіі і іншаму міраўспрыманню; навучыцца па новаму адчуваць прастору (дыялог з прыродай), камунікацыя і інш. Працаздольнасць, імправізацыйнасць, выпрацаваная падчас заняткаў, з'яўляецца неадемнай часткай характару чалавека.

Склад капэляў крыху з'мяніўся з першых этнаграфічных звестак да сённяшняга дня, але па функцыянальнасці застаецца склад траістай музыкі: меладычная функцыя, акордава гарманічная функцыя, рытмічная функцыя. Ў сучасных калектываў гэтая функцыянальнасць застаецца але з'яўляецца ускладненне мелодыі праз стварэнне дадатковых партый, голас праз тэрцыю, праз актаву і розныя дабаўленні на кожны густ.

Актуальнасць навучання дзяцей ігры на беларускіх народных музычных інструментах заключаецца ў прывучэнні чалавека да

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

традыцыйнай культуры з малых гадоў. Так, падчас працы ў Мачулішчанскім цэнтры культуры і вольнага часу як толькі гурткі вывучвалі мелодыю, адразу ладзілі маленькія выступленні, рабілі гульнявыя праграммы для іншых дзяцей. Дзеці бачылі запатрабаванасць і разумелі важнасць сваёй справы, атрымлівалі асалоду. Функцыі: камунікаціўнасць, эстэтычнасць,забаўляльнасць.

Тэрапеўтычнасць – заняткі традыцыйнай музыкай станоўча ўдзейнічаюць на фізічны і псіхалагічны стан здароўя. Камунікаціўнасць – музыцыраванне ў складзе капэлі дапамагае станаўленню асобы ў соцыуме, атрыманню сацыяльных сувязей. Садзейнічае пашырэнню светаўспрымання. Эстэтычнасць – навучэнне развівае і дапамае станаўленню эстэтычнага густу.

Дзіцячая капэля традыцыйнай беларускай музыкі ўяўляе сабой добрую магчымасць па далучэнню сучасных дзяцей да традыцыйнай музычнай беларускай культуры, музычнай культуры Беларусі, міфалогіі, рамёстваў.

У навуковай літаратуры, прысвечанай пытанням фалькларыстычных, культуралагічных, мастацтвазнаўчых даследаванняў, гісторыі этнамастацкай адукацыі прыводзяцца наступныя звесткі пра беларускія народныя музычныя абрадавыя інструменты – гэта ці інструментальная капэля, у якую ўваходзілі: традыцыйная скрыпка, дуда (пазней – часам і дыятанічныя цымбалы) у спалучэнні з ударнымі інструментамі (барабанам, бубнам з калатушкай), ці асобнае (сольнае) выкарыстанне ў абрадах вышэйпералічаных інструментаў.

Асаблівасці трансляцыі стыля і манеры інструментальнага акампаніравання да спеваў – гэта механізмы пераймання і музіцыравання ў беларускім музычна-інструментальным мастацтве вуснай традыцыі заснаваны на такіх фактарах, як: навучанне метадам дэманстратыўнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

антрапатэхнікі, імправізацыйнасць як самавыяўленне асобы, функцыянальнасць інструментальнага музіцыравання (сувязь з характэрнымі этнаграфічнымі мадэлямі паводзін беларусаў – абрадавымі спевамі і побытавым танцам). Для сучаснага адраджэння этнафанічна-абрадавай традыцыі амаль найважнейшым фактарам з’яўляецца практыка «жывога» ўдзелу моладзі ў каляндарных святах паралельна з інтэграцыяй дуды, дыятанічных цымбал, традыцыйнай скрыпкі ў шматузроўневую сістэму этнамастацкай адукацыі і этнакультурнага выхавання праз дзяржаўныя захады і грамадскія праекты.

---


1. Музыкальные инструменты мира / пер. с англ. Т.В. Лихач. – М. : Попурри, 2014. – 320 с.
2. Назина, И.Д. Белорусские музыкальные инструменты: Самозвучащие, ударные, духовые / И.Д. Назина [Ред. М.Я. Гримблант]. – Мінск : Наука и техника, 1991. – 120 с.
3. Назина И.Д. Белорусские музыкальные инструменты: Струнные инструменты / И.Д. Назина [Ред. М.Я. Гримблант]. – Мінск : Наука и техника, 1982. – 120 с.
4. Науменко, Г.М. Фольклорная азбука : Учебное пособие для начальной школы / Г.М. Науменко. – М. : Издательский центр «Академия», 1996. – 136 с.
5. Скорабагатчанка, А. Беларускія народныя музычныя інструменты ХХ стагоддзя : Вучэб. дапам. / А. Скорабагатчанка. – Мінск : Бел. Навука, 2001. – 398 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ